ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР

1989

20

КРАСАВІКА

№ 14 (1607)

Віншуем!

ПА ВЫНІКАХ Усесаюзнага спаборніцтва за 1988 год універсітэт і Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем выйшлі пераможцамі. Сёння ва ўрачыстай абстаноўцы калектывам будуць уручаны Пераходныя Чырвоныя Сцягі Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі.



АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

Соромна за беднасць

НЕ АДКРЫЮ Амерыкі, калі скажу, што быць выкладчыкам фізкультуры вельмі складана. І не толькі таму, што матэрыяльная база ў нас нікудышняя — гэта бяда ўсяго універсітэта. Справа яшчэ ў адносінах да гэтага прадмету. Заняткі па фізкультуры лічацца як бы другараднымі. Праўда, апошнім часам свядомасць студэнтаў нібы скранулася з мёртвай кропкі, ажыла. Менш сталі прапускаць заняткі. Больш сур'ёзна ставяцца да здачы норм комплексу ГПА. Здараецца, што рэзультаты не надта высокія, але па іх часта нельга меркаваць аб адносінах да фізкультуры, хутчэй яны гавораць аб нізкай фізічнай падрыхтаванасці студэнтаў першых-другіх курсаў. У такім выпадку даецца магчымасць здаць нарматывы з другога разу.

Напэўна, аб гэтым не давялося б гаварыць, калі б мы мелі хоць больш-менш падыходзячыя ўмовы для заняткаў спортам. Мяркуйце самі: для гэтых мэт у нас ёсць усяго дзве залы ў галоўным корпусе і адна ў Шчамысліцы. Нават стадыёна свайго не маем — арандуем «Дынама». Падлічыце, колькі гэта абыходзіцца універсітэту: кошт адной гадзіны — 20 рублёў (заняткі праводзяцца кожны дзень з 8.15 да 15.35 гадзін). Дадайце яшчэ арэнду басейна. Прыкінулі, якая лічба атрымаецца? Мала чаго не хопіць для будаўніцтва новага спартыўнага комплексу.

Зрэшты, ён будуецца, але надта марудна. То ў мінулым годзе абяцалі закончыць, то ў гэтым. Вось так і кормяць абяцанкамі. А калі мы будзем святкаваць навасэлле, ніхто не ведае. Толькі вельмі не церпіцца правесці заняткі ў спартыўных залах (іх будзе чатыры) і паплаваць ва ўласным басейне, бо ў тым, дзе мы займаемся сёння, нас, шчыра кажучы, не вельмі чакаюць. Самі разумееце — гаспадарчы разлік: кіраўніцтву лепш прадаставіць ваду, якой апошнім часам не хапае, платным групам (мы пераводзім грошы па пералічэнню). А 57 працэнтаў першакурснікаў не ўмеюць плаваць і мы павінны навучыць іх хаця б элементарным метадам.

Вельмі крыўдна за нашу беднасць. А набыць неабходнае не хапае грошай. Праўда, кіраўніцтва дапамагае, чым можа. Ніколі наша просьба не засталася неразгледжанай. Вось і ў гэтым годзе набылі тысячу пар лыж. Але гэтага катастрафічна мала. Таму і не можам як належыць наладзіць вучэбны працэс: усё ўпіраецца ў матэрыяльную базу.

С. МАКАРЭВІЧ,
загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁМНЯ · ЗАЎТРА

ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ

спецыялістаў, узмацненне палітыка-выхаваўчай работы — вось асноўныя напрамкі дзейнасці дэканата, партыйнага бюро і кафедраў факультэта радыёфізікі і электронікі. Аб тым, як яны спраўляюцца з гэтай задачай, ішла размова на пасяджэнні бюро парткома.

Камісія партыйнага камітэта, якая займалася даным пытаннем, разам са станоўчымі зрухамі ў арганізацыі вучэбнага працэсу, вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы выказала шэраг заўваг і прапаноў.

У прыватнасці, адзначана, што вучэбныя лабараторыі факультэта аснашчаны састарэлым абсталяваннем, адсутнічаюць у дастатковай колькасці сродкі вылічальнай тэхнікі. Для вырашэння гэтых пытанняў неабходна шырэй выкарыстоўваць сродкі, атрыманыя пры выкананні гаспадарча-дагаворных работ.

Звернута ўвага кіраўніцтва факультэта на тое, што неабходна актывізаваць палітыка-выхаваўчую работу, асабліва сярод студэнтаў першых і другіх курсаў. Для гэтага мэтазгодна было б выкладчыкаў-грамадазнаўцаў, што працуюць на факультэце, ставіць тут і на партыйны ўлік і даваць ім адпаведнае партыйнае даручэнне. Тады ў іх з'явіцца адказнасць за стан палітыка-выхаваўчай работы, а студэнты малодшых курсаў, пакуль няма спецыялізацыі, не будуць прадастаўлены самі сабе.

І яшчэ адно пытанне, якое звычайна лічыцца другарадным і якое так востра стаіць на факультэце — арганізацыя грамадскага харчавання. Члены бюро парткома выказалі спадзяванне, што кіраўніцтва факультэта, партыйная арганізацыя ў бліжэйшы час здымуць яго з парадку дня.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ГЭТА ІХ СТАРАННІ

прывялі да перамогі зборную факультэта радыёфізікі і электронікі па баскетболу на першынстве універсітэта па гэтаму віду спорту. Гэта яны задавалі тон у гульні, калі выступала каманда механіка-матэматычнага факультэта. Хто яны? Баскетбалісты і баскетбалісткі Юрый Рахманаў, Сяргей Цераховіч, Яўген Дрыгун, Алена Саверчанка і Вольга Маршчонак.

Дарэчы, аматарам спорту паведамляем вынікі першынства. Мужчыны: факультэт радыёфізікі і электронікі, фізічны і механіка-матэматычны — адпаведна на першым, другім і трэцім месцах. Жанчыны: у першым радку выніковай табліцы — механіка-матэматычны факультэт, другое і трэцяе месцы — у фізфака і ФПМ.

В. ШХІНЬЯН.

ПРАШУ СЛОВА

Як разблытаць клубок праблем?

Да цяперашняга часу ў ходзе перабудовы вызначыліся прынцыповыя напрамкі карэннага пераўтварэння ўсіх бакоў жыцця Савецкага грамадства і стратэгічныя метады іх рэалізацыі. Аднак канкрэтны механізм, сродкі дасягнення намечаных мэт яшчэ не зусім зразумелыя. Гэта стварае значныя цяжкасці пры складанні практычных планаў ажыццяўлення перабудовы ў розных сферах вытворчасці. Да таго ж, розныя бакі жыцця савецкага грамадства ўзаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя, таму неакрэсленасць у вырашэнні адной задачы выклікае нявызначанасць у шэрагу іншых.

Адзначанае (зразумела, адабраючы ў цэлым ідэю стварэння такога плану) можна аднесці і да «Тэзісаў праграмы Мінскага гаркома КПБ і Мінгарвыканкома па рэалізацыі важнейшых задач перабудовы».

Толькі скорагаворкай напамінаецца тут аб шляхах удасканалення вышэйшай адукацыі. Мінскі гарком КПБ і Мінгарвыканком, на жаль, застаюцца пакуль на няправільных пазіцыях у разуменні ролі адукацыі ў жыцці сучаснага грамадства. Зыходзячы з «астаткавага» прынцыпу забеспячэння ВНУ абсталяваннем і прыладамі, крайне недастатковага фінансавання, можна зрабіць вывад аб тым, што сістэма адукацыі па-ранейшаму разглядаецца як нешта другараднае, не так ужо і неабходнае для развіцця грамадства. Аб якой жа тады эканамічнай самастойнасці буйных ВНУ ідзе размова ў «Тэзісах»? Тым больш, што пры гэтым не ўлічваецца той агульнавядомы факт: рэалізацыя гэтага пункта практычна немагчыма да тае пары, пакуль прадпрыемствы і ўстановы не будуць аплочваць кошт падрыхтоўкі спецыялістаў ВНУ. Гэта, у сваю чаргу, магчыма пры ўмове эканамічнай зацікаўленасці ў выдатных спецыялістах. Зусім відавочна, што апошняе не ажыццявіцца без пераводу прадпрыемстваў на поўны гасразлік.

Раздзел «Экалогія» абяцае жыхарам нашага горада, што ўжо ў самы бліжэйшы час (1989—90 гады) павінна быць правезена поўная інвентарызацыя шкодных выкідаў прадпрыемстваў і арганізацый і на гэтай аснове зацверджаны іх экалагічныя пашпарты. Але кім і якім чынам будзе рэалізоўвацца гэта сапраўды неабходная і важная работа? Зразумела, што адпаведная арганізацыя, акрамя кваліфікаваных кадраў і складанай апаратуры, павінна быць забяспечана высокім узроўнем прававой і сацыяльнай абароны, якіх пакуль няма. Такім чынам, работа гэта пазбаўлена сэнсу.

Вось такія ў мяне меркаванні.

М. ГАРОШКА,
дацэнт кафедры неарганічнай хіміі.

ЗВЫЧАЙНА, калі размова заходзіць пра Добраахвотныя народныя дружыны, мы скептычна ўсміхаемся: маўляў, несур'ёзная гэта справа. Але другакурснік аддзялення гісторыі СССР гістарычнага факультэта Раман Паўлоўіч разважае інакш. Таму на працягу ўсёй вучобы ва універсітэце ён ніводнага разу не прапусціў дзяжурства. Больш таго, кожны раз, ідучы на ахову грамадскага парадку, ён загадзя складае прыкладны план, каб потым, на маршруце, не было непаразуменняў.

Раман — клапатлівы таварыш. Перад дзяжурствамі ён папярэджвае сваіх сяброў, прыйшоўшых упершыню, аб ускладзенай на іх адказнасці і небяспецы, якую таксама не заўсёды можна абысці.

А. ГУСАК,
студэнт гістарычнага факультэта
Фота АЎТАРА.

ЗАМЕСТ РЭАГАВАННЯ

КАМІТЭТУ НЕ ДА ГАЗЕТЫ

Вялікі стос нумароў «Беларускага універсітэта» ужо каторы месяц цясніўся на паліцы рэдакцыйнай шафы, з нецярпеннем чакаючы сустрэчы са сваімі чытачамі — выкладчыкамі і студэнтамі геаграфічнага факультэта. Праз тыдзень ён вырастаў на некалькі дзесяткаў экземпляраў, потым яшчэ і яшчэ... і, нарэшце, ператварыўся ў кіпу макулатуры, так і не ўбачыўшы свой факультэт. І каб жа далёка было да гэтай недасягальнай мэты! Адказнай за дастаўку газет на геафак Маі Юдыцкай варта было пераадолець нейкіх там сто метраў, і праблема знікла б. Аднак рабіць нават такі нязначны крок насустрач газеце, нягледзячы на неаднаразовыя запрашэнні рэдакцыі, камітэт камсамола факультэта не збіраўся, прынамсі, у бліжэйшы час. Таму давялося шукаць кантакт з партыйным бюро геафака, дзе ўся справа была вырашана фактычна за некалькі хвілін. Сакратар партбюро Генадзь Сцяпанавіч Смалякоў, праўда, не стаў выпрабоўваць у чарговы раз лёс газет — даручыў гэту «аперацыю» асістэнту кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў Аляксею Яўгенавічу Яротаву. На гэтым і скончылася гісторыя з пакінутымі газетамі. І ўсё ж журналісцкая дапытлівасць прывяла мяне ў пакой камітэта камсамола. Магчыма, і сапраўды ў «камітэтчыкаў» ёсць нешта важнейшае, чым распаўсюджанне універсітэцкай прэсы? Але, як выявілася, справа не толькі ў газетах. Не хапае факультэту (каго б вы думалі?) камітэта камсамола. Фармальна ён, вядома, ёсць. Нават выбраны па апошняму слову дэмакратыі: на агульнафакультэцкай камсамольскай канферэнцыі. І адразу ж пайшлі ў народ? Адмовіліся ад кабінетнага вопыту работы? Магчыма. Праўда, іншага стылю, мяркуючы па таму, як хутка намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце Юля Карпук развеяла мае ілюзіі, не набылі:

— Камітэт па-сутнасці распаўся. Сабрацца разам — і то праблема. Самога сакратара Ігара Грамыку днём з агнём не знойдзеш. Якая тут можа быць дзейнасць? Вядома, і пра газеты забыліся, не да іх.

М. ДЗЯБЕЛА.

ПАСТ СКРЫПТУМ.

Справа з дастаўкай і сапраўды зрушылася з месца. На наступны дзень студэнты, выкладчыкі геафака, нарэшце, атрымалі універсітэцкую прэсу за тры месяцы. А ці адбудуцца якія змены пасля паўгадавога сну ў камітэце камсамола факультэта?

ЗВЯРНІЦЕ ЎВАГУ!

СТВАРАЕЦЦА ЭКАЛАГІЧНЫ ЦЭНТР

У НАШЫМ універсітэце ствараецца грамадскі экалагічны цэнтр. Яго задачы:

— аб'яднанне намаганняў вучоных, студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта для аператыўнага вырашэння экалагічных праблем Беларусі;

— распрацоўка рэкамендацый па небяспечнаму выкарыстанню прадуктаў харчавання з улікам экалагічных забруджванняў;

— распрацоўка аптымальных варыянтаў аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Мяркуем, што свае прапановы па гэтаму пытанню вы выкажаце на арганізацыйным сходзе, які адбудзецца 27 красавіка, а 16-й гадзіне ў аўдыторыі 206 галоўнага корпуса універсітэта.

АРГКАМІТЭТ.

МАНАЛОГ ЗАЦІКАЎЛЕНАГА ЧАЛАВЕКА

ГРАМАДАЗНАЎЦЫ І... ЭКАЛОГІЯ

Эканамічны крызіс, які ўсё больш абвастраецца, абуральныя канкрэтныя факты экалагічных катастроф падводзяць нас да неабходнасці адказу на сакраментальнае пытанне: «Быць ці не быць?» А калі быць, то як?

Якімі ж сродкамі выхавання фарміраваць кампетэнтнага, гуманнага, валодаючага ўсёй шырынёй экалагічнай культуры спецыяліста? Пытанне, на мой погляд, патрэбна яшчэ спрасціць: якім чынам грамадазнаўца можа праводзіць экалагічнае навучанне? Што ён можа? З задавальненнем адкажу: усё. У тым выпадку, калі галоўным кірункам выхавання і навучання зробіцца экалагізацыя выкладання ўсіх навук, асабліва грамадазнаўчых. «Прабачце, навошта «нацягваць» штучныя паралелі?» — здзівяцца многія. Я спрабую запэўніць іх у адваротным.

Веданне заканамернасцей узаемаадносін жывых арганізмаў (чалавека таксама) і навакольнага асяроддзя фарміруецца комплексам навук: біялогіяй, геаграфіяй, глабальнай экалогіяй... Яно і павінна быць фундаментам грамадазнаўства. Без веданя дыялектыкі прыроднага і сацыяльнага разважанні аб грамадстве і яго далейшым развіцці могуць ператварыцца (і ператвараліся) у абстрактныя лозунгі, схемы, міфы. Грамадазнаўцам ніколі не шкодзіла б прытрымлівацца ў сваёй дзейнасці выказвання К. Маркса: «Прыродазнаўчыя навукі ствараюць аснову розных ведаў».

Сёння моладзь мае асаблівую патрэбу ў навуковых сацыяльных арыенцірах. Хто іх назаве? Грамадазнаўцы — спецыялісты, якія, як ніхто іншы, павінны адчуваць пульс сучаснай эпохі, ведаць тэндэнцыі развіцця чалавецтва, прадугледжваць умовы яго выжывання.

Чаму ж тады мы, выхоўваючы абстрактна эстэтычныя адносіны да прыроды, разуменне ўніверсальнай прыгажосці і гармоніі яе, забываем часам на неабходнасць барацьбы з разбуральнай дзейнасцю ў прыродзе, з гаспадараннем тэхнакратычнага мыслення міністэрстваў і ведамстваў, якія ажыццяўляюць так званыя «пераўтварэнні прыроды»? Закрываць на гэта вочы азначае ніколі не ўбачыць студэнтаў непрымірымымі да экалагічнай разбэшчанасці, неадукаванасці, авантурызму.

Навошта наракаць на аддаленасць глабальных пераўтварэнняў у ахову навакольнага асяроддзя, калі даўно зразумела: маленькае экалагічнае злачынства можа прывесці да катастрофы? Вы не ведаеце, хто абароніць дубровы ў Шчамысліцы? А ў мяне ёсць адказ: студэнты і выкладчыкі універсітэта, узброеныя экалагічнымі ведамі аб унікальнасці гэтай дубровы, аб значэнні для нашага жыцця зялёных пасадак, якіх у Мінску ў восемдзесяць разоў менш за норму на душу насельніцтва.

Сярод навучэнцаў нашага універсітэта разгортваецца «зялёны» рух. Магчыма, многім вядомыя члены дружыны па ахове прыроды: Юрый Жарко, Дзмітрый Орда, Марына Зубрылкіна. Задача грамадазнаўцаў — шырэй уцягваць у гэты рух студэнтаў усіх факультэтаў, фарміраваць высокамаральную грамадзянскую пазіцыю.

Псеўдадзейнасць, імітацыя працы ў час суботнікаў тут не падыходзяць. Поле дзейнасці часта знаходзіцца побач: пасадкі дрэў на тэрыторыі універсітэта. Акрамя таго, студэнты БДУ павінны займацца і рашэннем такіх задач, як захаванне чысціні Камсамольскага возера, аднаўленне і пашырэнне лесапаркавай зоны, умацаванне астравоў, якія разбураюцца. Маюць патрэбу ў маладой энергіі «лёгкія горада» — прыгарадныя лясы, якія выглядаюць глухімі і непраходнымі ад завалаў сушняку і смецця. У свой час аўтар гэтых радкоў, а таксама многія выкладчыкі старэйшага пакалення актыўна займаліся пасадкамі дрэў каля карпусоў універсітэта, стварэннем лесапарку «Перамога».

Чалавек не павінен жыць у бетона-асфальтавых джунглях, харчавацца нітратамі і заўчасна паміраць ад раку. Фарміраванне экалагічнай свядомасці мас у многім залежыць ад будучых спецыялістаў, якія б валодалі экалагічнай культурай.

Тут і павінны грамадазнаўцы сказаць тыя словы, якія б перадалі ўсю глыбіню і мудрасць марксісцка-ленінскага вучэння аб эканамічным, экалагічным становішчы нашага грамадства. Яно ж мае патрэбу ў пераўдове не толькі эканомікі і палітыкі. У адносінах чалавека да прыроды, пераадоленні экалагічнага крызісу таксама. Фокусам узаемазвязанай і ўзаемаабумоўленай адзінай сістэмы марксісцкай тэорыі павінна выступаць скразная тэма чалавека, яго светапогляду, жыцця і ўзаемаадносін з прыродай. Таму праблемы экалогіі, навуковага прыродакарыстання я лічу важнымі для ўсіх састаўных частак марксізму, якія выкладаюцца ў ВНУ.

На жаль, пакуль у курсах грамадскіх навук яшчэ не адноўлена сапраўднае марксісцка-ленінскае вучэнне аб ролі прыроды ў жыцці чалавека, аб чалавеку як частцы прыроды, аб працы як працэсе абмену рэчываў і энергіі паміж чалавекам і прыродай.

А было б добра ўзмацніць акцэнт на фарміраванні ўспрымання экалагічнай рэчаіснасці як ядра навуковай карціны свету, больш глыбока раскрыць светапоглядное агульнанавуковае паняцце «прырода», «біясфера», абапіраючыся на міждысцыплінарны сінтэз навуковых ведаў.

Для палітэканомаў найбольш важна выкладаць і фарміраваць канцэпцыю навуковага прыродакарыстання, рэсурсазахавання, экалагізацыі вытворчасці, эканомікі прыродакарыстання і «эканоміі прыроды» (В. В. Дакучаеў), экалагічных аспектаў харчовай праграмы, барацьбы з безгаспадарчасцю, экалагічным невуцтвам, якое яшчэ праяўляецца ў эканоміцы сацыялізму.

Развіццё тэорыі навуковага сацыялізму ва ўмовах новага палітычнага мыслення, дзе галоўнай каштоўнасцю з'яўляецца жыццё чалавека, павінна зыходзіць з узрастаючага значэння прыроды ў развіцці грамадства.

Неабходна шырэй прапагандаваць замежны вопыт экалагізацыі вытворчасці і ўсяго грамадскага жыцця ў такіх краінах, як Швецыя, Канада, Японія. Ёсць неабходнасць і ў вывучэнні вопыту арганізацыі экалагічнага руху на Захадзе, узаемасувязей эколага-палітычных задач.

Мы прызвычаіліся да погляду на навукова-тэхнічную рэвалюцыю як на ўсебаковы прагрэс і доўгі час не звярталі ўвагі на яе негатыўныя вынікі.

Між тым грамадазнаўцам патрэбна больш глыбока і абгрунтавана прапагандаваць прыродаахоўную дзейнасць КПСС і Савецкай дзяржавы. А таксама навуковыя ідэі вядомых вучоных: В. І. Вярнадскага, В. В. Дакучаева, С. Г. Струміліна, С. С. Шварца, М. М. Маісеева, І. Т. Фралова, А. М. Яблакава, С. Залыгіна, пераконваць у неабходнасці навуковага фундаменту для прыняцця палітычных рашэнняў, фарміраваць эколага-палітычны стыль мыслення.

І галоўная задача грамадазнаўцаў зводзіцца не толькі да таго, каб пераканаць у неабходнасці змен адносін людзей адзін да аднаго і да прыроды, але і на справе, на практыцы разам з моладдзю ўдзельнічаць у рэвалюцыйным працэсе перабудовы. А калі не мы, дык хто ж?

А. КЛЁСАВА,
дацэнт кафедры
марксісцка-ленінскай
філасофіі прыродазнаўчых
факультэтаў.

ВЫБАРЫ І НАШ ВЫБАР

«ЗА КАГО ГАЛАСАВАЛІ?»

У час апошняга перапынку гэтае пытанне прагучала побач са мной не менш як дваццаць разоў. Сход працоўнага калектыву універсітэта, па ўсім было відаць, зацягваўся. Да надыходу дванаццатага красавіка заставалася некалькі хвілін. Тым адзінкам, што, пакідаўшы бюлетэні, зніклі (магчыма, і па ўважлівых прычынах), ніхто не зайздросціў. Чакалі паведамленняў падліковай камісіі.



У той дзень нікога з кандыдатаў у кандыдаты не магла непакоіць думка аб надыходзячых экзаменах. Тым больш, што адбудуцца яны значна пазней. І толькі для тых, хто, вытрымаўшы перадвыбарны марафон, пераможа.

Як звычайна ў час сесіі, пачынаць давялося з залікаў. Кожны студэнт растлумачыць вам, з якой цяжкасцю даецца першы запіс ў залікоўцы. А калі пры наяўнасці 561 «выкладчыка» дзевяць «студэнтаў»? І для таго, каб «сябе паказаць» ёсць толькі дзесяць хвілін, а астатняе — на пытанні (ні ў якім разе не па білету): патрабавальныя — «чаму вы, вучоныя, вырашылі займацца палітыкай?», з падкавыкай — «вы, як юрыст, карысталіся ў сваёй навуковай дзейнасці працамі Вышынскага?», надзённыя — «што вы зможаце зрабіць канкрэтна для універсітэта», сярдзіта-катэгарычныя — «ваша праграма складзена з урыўкаў іншых»...



Да свабоднага мікрафона ў зале (можаце ўпэўніцца, зірнуўшы на здымкі) стаяла вялікая чарга. Часам было нават цяжка зразумець, чаму бяруць на іспыт таго ці іншага кандыдата: за тое, што праграма прывабліве ці наадварот. Затое ў час галасавання, як адзначыў член падліковай камісіі Ігар Пастухоў, «панавала дзіўнае аднадушша». Кандыдатаў на кандыдацкае месца было дзевяць: навуковы супрацоўнік НДІ ФХП Валерый Міхайлавіч Гарбачоў, дацэнт юрыдычнага факультэта Пётр Азаравіч Дубавец, рэктар універсітэта Леанід Іванавіч Кісялеўскі, малодшы навуковы супрацоўнік кафедры фізікі паўправаднікоў Мікалай Іванавіч Качанаў, загадчык кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі Ігар Аляксандравіч Малевіч, загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі Яўген Пятровіч Пятраеў, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Зянон Станіслававіч Пазняк, прарэктар універсітэта Валерый Гур'евіч Ціхіня, прарэктар універсітэта Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч.

Валерый Гур'евіч Ціхіня і Ігар Аляксандравіч Малевіч знялі свае кандыдатуры.

У выніку галасавання большасцю дэлегатаў (302) была падтрымана кандыдатура С. С. Шушкевіча, прапанаваная працоўнымі калектывамі СКТБ з ВВ і кафедры ядзернай фізікі і электронікі.

* * *

У выніку перадвыбарнай барацьбы на акруговым сходзе з 17 прэтэндэнтаў да рэгістрацыі па Мінскай — Маскоўскай тэрытарыяльнай акрузе № 564 прадстаўлены 4 чалавекі:

Цернавы Алег Сяргеевіч — загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі МДПІ імя А. М. Горкага;

Шушкевіч Станіслаў Станіслававіч — прарэктар БДУ імя У. І. Леніна;

Шлындзікаў Васіль Міхайлавіч — дырэктар завода «Ударнік»;

Паўлюшчык Леанід Віктаравіч — дырэктар інстытута «Белгіпрагаз».

«БЕЛЫЯ ПЛЯМЫ» ГІСТОРЫІ—

так назвалі рэтраспектыву фільмаў Богдана Парэмбы супрацоўнікі кінатэатра «Масква». Кінарэжысёр вядомы савецкаму гледачу па сумеснаму польска-савецкаму фільму «Яраслаў Дамброўскі». Зараз ён знаходзіцца ў Мінску. Працуе над пастаноўкай спектакля «Лета ў Наане» па Я. Івашкевічу ў тэатры-студыі кінаакцёра.

Фільмы дэманструюцца з 19 па 29 красавіка. Даведкі па тэлефоне 23-14-48.

А. КОШАЛЕВА,
метадыст кінатэатра
«Масква».

РОДНАЕ СЛОВА

За беларуска-рускую двухмоўнасць

Пытанні беларуска-рускай двухмоўнасці, ролі і месца беларускай мовы ў агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі, яе стану і статусу надзвычай важныя для ўсіх падраздзяленняў вышэйшай школы, але асабліва значныя і надзённыя яны для такіх яе структурных звенняў, якімі, у прыватнасці, з'яўляецца факультэт журналістыкі.

Таму мы, выкладчыкі і студэнты, больш як хто зацікаўлены ў авалоданні беларускай мовай, у пашырэнні яе выкарыстання. Многія нашы выпускнікі накіроўваюцца на работу ў рэдакцыі раённых газет, якія выходзяць на беларускай мове. Ёй аддаецца перавага на радыё і тэлебачанні, рэдакцыі якіх таксама папаўняюцца нашымі выпускнікамі. Каб быць добрым журналістам, неабходна абавязкова выдатна валодаць роднай мовай, тады матэрыялы будуць вобразныя і літаратурна адпрацаваныя.

Лічу, што патрэбна пачынаць са школы. Дзе гэта бачна, каб у нацыянальных школах не вывучалі родную мову? Аказваецца, у нас можна, дастаткова толькі напісаць заяву.

Паводле існуючых правілаў прыёму абітурыент мае права выбару мовы пры здачы ўступнага экзамену па мове і літаратуры. Гучыць гэта знешне прыстойна, прыймальна і ўпаўне дэмакратычна — «па выбару». Але на практыцы атрымліваецца, што толькі адзінкі з паступаючых здаюць беларускую, усе астатнія — рускую мову і літаратуру.

Здаюць — і паступаюць на факультэт. Вось тут і пачынаецца... Паспрабуй ужо на першым годзе навучання прайсці вучэбна-азнаямляльную, а затым вытворчую практыку ў рэдакцыях беларускіх газет, радыё, тэлебачання, калі не толькі не вывучаў, а і не чуў гучання самой гэтай мовы.

Таму і даводзіцца часам выслухоўваць нараканні з боку кіраўніцтва асобных рэдакцый і асабліва тэле- і радыёвяшчання наконт недастатковай моўнай падрыхтаванасці выпускнікоў. Каб гэтага не атрымалася, лічу мэтазгодным пры паступленні на факультэт увесці, пачынаючы з бягучага года, экзамен па беларускай мове і літаратуры для ўсіх паступаючых на факультэт журналістыкі. Той, хто піша, скажам, рускае сачыненне, павінен здаваць вусны экзамен па беларускай мове і наадварот. Такую форму паатэстацыі неабходна ўвесці і пры правядзенні творчага конкурсу абітурыентаў. Акрамя таго, неабходна павялічыць колькасць лекцыйных і практычных гадзін па курсу сучаснай беларускай мовы на стацыянарным і завочным аддзяленнях факультэта; падрыхтаваць і выдаць у 1990—1995 гадах новыя вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове і стылістыцы, літаратурнаму рэдагаванню; працягваць выпуск кафедральнага зборніка «Культура мовы журналіста»; ажыццявіць паступовы пераход да выкладання ўсіх журналісцкіх дысцыплін на беларускай мове...

Зразумела, што для вывучання мовы патрэбен нейкі стымул (звычайным чытаннем лекцый тут не абысціся). Таму добра было б часцей арганізоўваць сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў з дзеячамі беларускай культуры: пісьменнікамі, журналістамі, прадстаўнікамі музычнага і выяўленчага мастацтва, гісторыкамі, краязнаўцамі, фальклярыстамі. Разам з тым неабходна глыбей вывучаць эстэтычныя каштоўнасці, створаныя іншымі братнімі народамі нашай краіны.

Лічу, што гэтае і некаторыя іншыя мерапрыемствы ў дадзеным напрамку дазволяць палепшыць моўную сітуацыю на факультэце і будуць садзейнічаць развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці.

А. НАРКЕВІЧ,
загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, прафесар.



Радыёфізікі, яднайцеся!



Пэўна, нават тая самалюбівая варона, што брала пасля гісторыі з сырам урокі спеваў, была здзіўлена: такой колькасці песень, музыкі і смеха Шчамысліцкая дуброва не чула ўжо год. З апошніх, дзевятых Дзён Радыёфізіка.

Спецыялістамі падлічана: адзін наш радыёфікік за гады вучобы толькі бульбы збірае больш, чым усе студэнты Англіі, Францыі і Злучаных Штатаў, узятыя разам.

Таму дзесятыя, юбілейныя, Дні Радыёфізіка, ператварыліся ў свята міжнароднае. Гэта не перабольшанне — сярод гасцей ДРФ не толькі масквічы, гаркаўчане, харкаўчане, каманды з Тбілісі і Ерэвана, але і студэнты і аспіранты Сафійскага універсітэта.

Першыя дні красавіка дастойныя быць занесенымі ў кнігу рэкордаў Гінэса — па колькасці прапушчаных гадзін на факультэце радыёфізікі і электронікі і па сіле апладысментаў, што суправаджалі выступленні гаспадароў свята і іх гасцей.

І. ФЕДАРАВА.
Фота С. ГРЫЦА.

ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Першыя крокі

«Нам патрэбна праўда, як паветра, як само жыццё. Толькі архівы даюць нам магчымасць запоўніць «белыя» плямы. Патрэбна смялей і больш поўна паказваць на выстаўках, друкаваць у газетах, кнігах архіўныя матэрыялы. Гэта дапаможа нам развіваць надалей нашу савецкую беларускую культуру».

Вось такія словы камсамолец 20-х гадоў, ветэран партыі і Вялікай Айчыннай вайны, прафесар Міхаіл Сяргеевіч Кацер пакінуў у кнізе водгукаў аб выстаўцы «Першыя крокі», арганізаванай Цэнтральным дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва рэспублікі і прысвечанай 70-годдзю ўтварэння БССР і КПБ. Яна экспанавалася ў памяшканні Аб'яднання літаратурных музеяў, што ў Траецкім прадмесці.

Нягледзячы на амаль мізерную колькасць паведамленняў у рэспубліканскім друку, па радыё і тэлебачанню, за кароткі час (каля чатырох месяцаў) выстаўку наведалі каля паўтары тысячы чалавек.

«Выстаўка вяртае нас у мінуўшчыну, разглядае дзейнасць апантаных, таленавітых людзей Беларусі. Матэрыялы падабраныя цікавыя, адчуваеш подых гісторыі, сілу народнай творчасці». (А. Кароль, студэнт філфака БДУ).

— Сапраўды, дапамагае нам Лілія Ільінічна Балыніна, загадчык аддзела публікацый і навуковага выкарыстання дакументаў ЦДАМЛМ БССР,— тыя нешматлікія, але зацікаўленыя наведвальнікі змаглі ўбачыць шмат невядомага з гістарычнага і культурнага жыцця Беларусі 1919—1929 гадоў.

«Няблага, сапраўды. Болей такіх выставак, абвестак у друку і нам непатрэбна будзе выдумляць усё зноў, таму што яно ў нас было — бацькаўшчына, культура, мова» (Зміцер Яцкевіч, археолаг).

Многія вядомыя дзеячы культуры рэспублікі,— гаворыць Лілія Ільінічна,—перадаюць нам свае фонды, бібліятэкі. Выстаўка падрыхтавана ў асноўным па матэрыялах і дакументах вядомага беларускага грамадскага і культурнага дзеяча рэспублікі Язэпа Лявонавіча Дылы, які перадаў нам сваю бібліятэку. У першыя гады станаўлення Савецкай Беларусі ён займаў шэраг адказных дзяржаўных пасад, быў кіраўніком Інбелкульта (Інстытут беларускай культуры), наркомам працы ў першым урадзе Беларусі. Язэп Дыла вёў разнастайную літаратурную дзейнасць. Ён аўтар гістарычнага рамана «На шляху з варагаў у грэкі»; аповесцяў, гістарычнай драмы «Падуанскі студэнт», шэрагу артыкулаў па гісторыі культуры і ўспамінаў. Гэтыя і іншыя творы былі падрыхтаваны да друку вядомым даследчыкам беларускай гісторыі і культуры доктарам філалагічных навук А. І. Мальдзісам і ўбачылі свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» у 1981 г.

«Дзякуючы вашай выстаўцы ў нас з'явілася магчымасць пазнаёміцца бліжэй, а ў некаторых выпадках і ўпершыню пачуць вядомых у свой час беларускіх артыстаў, пісьменнікаў, паэтаў і кіраўнікоў беларускага літаратурнага грамадства, тых, каго незаслужана забылі праз гады сталінскага тэрору. Дзякуй стваральнікам выстаўкі за гэты сапраўды «першы крок» у маім родным горадзе».

— Вось, напрыклад, — працягвае Л. І. Бялыніна,— пасведчанне № 33 Я. Дылы як члена ЦВК Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў, дэлегацкі білет № 454 Я. Дылы на VII Усебеларускі з'езд Саветаў, рэдкія і ўнікальныя здымкі членаў першага ўрада Беларусі. Дакументы, што сведчаць аб тых нялёгкіх абставінах, у якіх утвараласа Беларусь. Змешчаныя арыгіналы тагачасных газет і часопісаў, першыя выданні твораў Я. Купалы і Я. Коласа тых часоў, асобныя творы літаратараў напамінаюць аб утварэнні пісьменніцкіх арганізацый. Змешчана перапіска Язэпа Лявонавіча Дылы з вядомымі дзеячамі культуры. Частку экспазіцыі займае паказ культурнага жыцця рэспублікі ў той перыяд. Змешчаныя фотаздымкі вядомых беларускіх акцёраў Я. Рамановіча, У. Крыловіча, Л. Ржэцкай, тэатральныя афішы з праграмамі спектакляў на сезон, напрыклад, у праграме Беларускага дзяржаўнага першага тэатра — «Тутэйшыя» Я. Купалы, «Кастусь Каліноўскі» у пастаноўцы Міровіча. Экспануюцца дакументы, якія сведчаць аб дзейнасці аднаго з заснавальнікаў беларускага савецкага тэатра У. Галубка, народнага артыста БССР.

Усе дакументы, якія экспануюцца сёння, гэта толькі мізэрная частка таго, што мы маем. Галоўная наша праблема — неабходнасць наяўнасці памяшкання для архіва-музея. Як архіў-музей мы існуем ужо з 1960 года, але ўсё яшчэ пакутуем без добраўпарадкаванага памяшкання, маючы каля 300 фондаў, мы не здольны нічога паказаць, нашы здабыткі пыляцца на паліцах. Частку мы экспанавалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, падрыхтавалі ў Доме літаратара невялічкую экспазіцыю пра часы сталінскага тэрору ў адносінах да творчай інтэлігенцыі тае пары. Але ўсё ж хочацца мець свой кут. У 1976 годзе выйшла пастанова дырэктыўных органаў аб далейшым развіцці і пашырэнні архіваў-музеяў, але куды мы ні звярталіся, так усё і засталося толькі на паперы.

«Можа калі было б болей гэткіх выставак, а таксама і артыкулаў, тэлепраграм, святкаванняў, і не чураліся б беларускія людзі сваёй мовы, не саромеліся б сваіх бацькоў, беларускай вёскі».

— Мы рады,— гаворыць Л. І. Балыніна,— што амаль без ніякіх паведамленняў да нас прыйшло столькі людзей. Іх магло быць і больш, бо тых, каго цікавіць гісторыя і недалёкае мінулае, каму хочацца ведаць, што было і як яно адбывалася, у каго ёсць пачуццё нацыянальнай самасвядомасці, шмат.

Але на працягу работы выстаўкі выявілася, на наш погляд, вельмі слушнае пытанне, якое выдатна сфармулявалі выкладчыкі МДПІ імя М. Горкага А. Платонаў і С. Туміловіч:

— Наведалі выстаўку і задаволены. Але не ўсім. Яна патрабуе істотных дапаўненняў. Многія людзі, якія маюць каштоўныя дакументы, не ведаюць, куды іх перадаць. А ў архіва, як стала вядома, нават і гэтую залу могуць адабраць. І калі такое здарыцца, гэта будзе глупствам, калі не злачынствам. Думаюць кіраўнікі ці не аб тым, што пагражае нашай культуры, калі мы, зрэшты, не зірнём на гэтае пытанне сур'ёзна.

Першыя крокі... Няхай жа будуць наступныя: другія, трэція, дзесятыя, сотыя...

В. ДАЛІДОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.



ШТО НОВАГА?

Станьце ў чаргу!

Легкавы аўтамабіль — не раскоша ў век хуткасцей, але наша жыццё часам дыктуе свае ўмовы, абвяргаючы бясспрэчныя ісціны, ставячы мноства людзей у нязручнае становішча (дакладней: у чаргу). Зрэшты, дагэтуль у нас ва універсітэце чаргі ў справядлівым сэнсе гэтага слова не было. Блытаніна ў размеркаванні, вядома, выклікала незадаволенасць у выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, жадаючых набыць аўтамабіль. У гэтым годзе страсці вакол аўтамабіляў набылі асабліва востры характар: невядома па якіх прычынах (ці за якія грахі) Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР выдзеліла калектыву БДУ каля дзесяці аўтамабіляў, а жадаючых стаць іх уладальнікамі ўжо чатырыста чалавек. Таму на пасяджэнні прафсаюзнага камітэта мы вырашылі з 15 красавіка завесці кнігу ўліку выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія падалі заявы на набыццё аўтамабіляў. Дата падачы заявы будзе адным з важнейшых крытэрыяў пры ўстанаўленні паслядоўнасці атрымання асабістых транспартных сродкаў. Акрамя таго будзе створана чарга сярод падраздзяленняў. Тыя факультэты, лабараторыі і НДІ, на якія размеркавалі пэўную колькасць аўтамабіляў сёлета, застануцца па-за размеркаваннем.

Магчыма, хтосьці пры такой сістэме дзялення палічыць сябе пакрыўджаным. Вынайсці ўсеагульнапрымальны варыянт, задаволіць патрэбнасць у аўтамабілі кожнага жадаючага зараз практычна нерэальна. Пакуль існуе дэфіцыт легкавога аўтатранспарту, ні адзін спосаб размеркавання не вырашыць праблему. І ўсё ж прынятыя прафкомам меры не марныя. У рэшце рэшт надзея набыць уласны аўтамабіль гарантавана чаргой, застаецца толькі запасціся цярпеннем.

В. АНІШЧЫК,
старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў.

АБСКАРДЖАННЮ НЕ ПАДЛЯГАЕ?

Доўгі час справы ваеннай кафедры не выносіліся на шырокае абмеркаванне ў студэнцкіх колах. Сёння ж мы вылучаем шэраг пытанняў вакол «ваенкі» амаль што на першыя пазіцыі. Яны старыя, гэтыя пытанні. І, мабыць, менавіта таму самыя набалелыя і хвалюючыя. «Перабудова на «ваенцы» ужо пачалася!» — гэтая заява ў адносінах, напрыклад, да Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі зусім не беспадстаўная (чытайце лютаўскі нумар часопіса «Юность»). Станоўча вырашаны чатырнаццаць з пятнаццаці патрабаванняў студэнтаў КДУ, значныя змены адбыліся ў Вільнюскім універсітэце, Маскоўскім і Ленінградскім... А што ў нас?

«Перабудова ў нас на кафедры пачалася гадоў дзесяць назад!..»

Калі мы ўпершыню прыйшлі на заняткі па ваеннай падрыхтоўцы, адразу адчулі, што гэтая фраза выконвае ролю своеасаблівага шчыта, аб які разбіваюцца ўсе непажаданыя для нашых выкладчыкаў пытанні. Яе паўтаралі ў розных варыяцыях: дзесяць гадоў, пятнаццаць, дваццаць пяць. Сапраўды, на «ваенцы» у нас някепска. Бадай, ніводная другая кафедра універсітэта не можа пахваліцца такой чысцінёй і абсталяванасцю вучэбных кабінетаў. Тым больш, што (расказваюць старэйшыя студэнты) у апошні час адбылося шмат станоўчых змен, якія павінны палепшыць якасць адукацыі.

Адменена абавязковая ваенная форма ў час вучэбных нарадаў, перагледжаны вучэбныя планы, тэрмін навучання на ваеннай кафедры скараціўся на цэлы семестр, выкладчыкі ў многіх выпадках ідуць насустрач студэнту, калі, напрыклад, узнімаюць пытанні наведвання заняткаў.

Дэфіцыт узаемапаразумення, якога бракуе ў адносінах паміж начальнікам і падначаленымі ў арміі, усё ж такі адчуваецца і ў нас. Перш за ўсё таму, што многім афіцэрам цяжка адмовіцца ад звыклых стэрэатыпаў мыслення.

Напэўна, больш за ўсё цяпер хвалюе студэнтаў праблема размеркавання вучэбных гадзін па дысцыплінах. Смеху (а магчыма, і слёз) варта: на прафіліруючую дысцыпліну — тэорыю і практыку савецкай журналістыкі — адведзена на дзве гадзіны менш, чым на ваенную падрыхтоўку.

— Каго з нас рыхтуюць? — пытаецца адзін студэнт журфака ў другога. Той у адказ:

— Журналістам можаш ты не быць, а лейтэнантам быць павінен.

— Ну, што тут зробіш,— ківае галавой першы.— Павінен...

Сапраўдная перабудова на «ваенцы» залежыць перш за ўсё ад таго, наколькі рашуча здолее кіраўніцтва адмовіцца ад стэрэатыпаў і, нягледзячы на тыя паўмеры, што ўжо зроблены, выразіць шэраг пытанняў, якія датычаць набыцця ваеннай прафесіі. Трэба спадзявацца, што галоўным для ваеннай кафедры і па сённяшні час засталося стварэнне неабходных умоў для таго, каб выпускнік ВНУ валодаў вайсковай спецыяльнасцю. Гэтая задача сугучна з палажэннем Канстытуцыі СССР аб абавязку кожнага грамадзяніна абараняць Радзіму. Але наколькі рацыянальна гэта арганізавана?

На справе атрымліваецца так: студэнт, трапіўшы на «ваенку», пачынае вывучэнне той спецыяльнасці, якую яму прапануюць (са студэнтаў факультэта журналістыкі, напрыклад, рыхтуюць камандзіраў мотастралковых узводаў). Але якую сувязь, даруйце, можна ўгледзець паміж гэтай спецыяльнасцю і спецыяльнасцю журналіста? Ці будуць яны дапаўняць адна другую, а, значыцца, і спрыяць лепшаму вывучэнню?.. Да таго ж, студэнт, які адслужыў два гады ў войску, ужо мае пэўную спецыяльнасць (у залежнасці ад таго, у якім родзе войск праходзіў тэрміновую службу). ці ёсць неабходнасць у тым, каб чалавек, ужо маючы адну спецыяльнасць, пачынаў з нуля вывучэнне другой? Ці не лепш было б зрабіць так, каб вывучалася адна і тая ж дысцыпліна? Тады і веды былі б больш дасканалымі, і практычныя навыкі. У выніку выйграла б ад гэтага агульнадзяржаўная справа абароны Радзімы.

На сустрэчы з намі начальнік вучэбнага цыклу палкоўнік М. П. Грэчанок паведаміў: для тых, хто адслужыў тэрміновую службу, з восені 1989 года ўводзіцца новы план навучання. Да гэтае пары нам незразумела, чаму «армейцы» павінны праседжваць цэлы дзень у тыдзень на працягу ўсяго семестра, вывучаючы матэрыял па «чужой» праграме, разлічанай на тых, хто яшчэ і паняцця не мае аб армейскай службе.

Што, на мой погляд, неабходна, каб пазбегнуць такіх недарэчнасцей?

Па-першае, студэнты, якія не праходзілі тэрміновую службу (і, у сувязі з выданнем адпаведнага загаду, ужо не будуць праходзіць), павінны атрымліваць ваенную спецыяльнасць блізкую да прафіліруючай (як, дарэчы, зроблена ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце). Для гэтага неабходна сувязь паміж ваеннай кафедрай і адпаведнымі факультэтамі, якой мы, студэнты, пакуль не адчуваем. На апошнім, сакавіцкім, пасяджэнні дэканата журфака было вырашана ўладкаваць пытанні аб пераводзе або замене ваеннай спецыяльнасці мотастралка на намесніка камандзіра па палітычнай частцы. Гэта ўжо бліжэй да журналістыкі. Але ёсць тут — і яно цалкам магчыма — іншае меркаванне. Аб тым, на што здольныя мотастралковыя войскі ў час ядзернай вайны, гаварыць не даводзіцца (як кажуць у арміі, «ККД роўны нулю»). Мотастралкі рыхтуюцца да вядзення баявых дзеянняў у сучаснай вайне без выкарыстання ядзерных узбраенняў. Простая логіка: хіба ў такой вайне не патрэбныя журналісты? Дык хто ж у такім разе лепш: спецыяліст-універсал, які ў адной асобе ўвасабляе і мотастралка, і журналіста, і механіка самалёта-знішчальніка (а на справе толкам не валодае ніводнай з пералічаных спецыяльнасцей), ці адукаваны журналіст?..

А калі б замест ваеннай кафедры ўвесці паглыблены курс ваеннай журналістыкі? Думка, на першы погляд, дзёрзкая і нерэальная, але, лічу, менавіта ў гэтым будзе сапраўднае вырашэнне ваеннай справы на факультэце журналістыкі.

Акрамя таго, галоўнага, існуе яшчэ шмат пытанняў, якія павінны вырашацца ў найкарацейшы тэрмін.

Узяць хаця б тыя ж стандартныя прычоскі. Факт гэты відавочны: прыходзіць на заняткі з доўгімі валасамі забараняецца. У супрацьлеглым выпадку студэнт атрымлівае заўвагу, далей — «жалезабетонную» вымову. Прычым (фармальна) за тры вымовы куратар групы можа ўжо пісаць рапарт рэктару аб выключэнні студэнта з БДУ. Умовы, што ні кажыце, пастаўлены жорсткія. А як жа інакш?

Мяркуецца, пры ваеннай дысцыплінаванасці так і павінна быць. Толькі вось, згодна з усімі паперамі, атрымліваецца, што студэнт можа быць выключаны з універсітэта толькі за тое, што асмеліўся насіць нестандартную прычоску. Абсурд, скажаце вы. Праўда, выпадку такога ў гісторыі яшчэ не было, але магчымасць захоўваецца. Зразумела, лепш зрабіць сваю галаву знешне стандартнай, чым развітацца са студэнцтвам. Але гэта ўжо першы крок да таго, каб стаць стандартным не толькі знешне, але і ўнутрана.

21 сакавіка гэтага года выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб скарачэнні Узброеных Сіл СССР і расходаў на абарону на працягу 1989—1990». Гэтае рашэнне ўраду нашай краіны стварае ўсе ўмовы для таго, каб пачаць сапраўдную перабудову ў арміі. Думаю, што далейшыя мерапрыемствы па выкананню гэтага Указу ў многім залежаць ужо ад кіраўніцтва на месцах. У многіх выпадках не трэба чакаць адпаведнай дырэктывы. Кіяўляне, у прыватнасці, даказалі, што пазбавіцца праблемы другога прызыву ў якасці афіцэраў можна ў межах акругі. У Кіеўскай ВА такой праблемы ўжо няма. У беларускай жа...

Ва ўсялякім выпадку, тое, што можа быць зроблена ў межах здаровага сэнсу, павінна быць зроблена, і дабівацца рэальных вынікаў трэба ўжо сёння.

І. ДРАПУН,
студэнт журфака.

Фотакалаж
С. ГРЫЦА.

КРУ-У-ГОМ!

Студэнты — народ кемлівы: калісьці прамільгнула думка аб тым, што ваенная навука аднімае час, які б пайшоў на карысць прадметам па спецыяльнасці, і ўжо не давала спакою, перарастаючы ў перакананне. «З'явіліся групы, якія павялі атаку на ваенную кафедру.

Нават з вялікай нацяжкай выступленні студэнтаў хваляю забастовак не назавеш. Адмовіліся наведваць заняткі па «медыцыне» другакурсніцы філфака. Праігнараваў аднойчы «ваенку» трэці курс факультэта журналістыкі і рускага аддзялення філфака. І ўсё ж такое арганізаванае нежаданне наведваць заняткі па ваеннай падрыхтоўцы — адна з форм выражэння грамадскай думкі студэнтаў. І калі да гэтае пары яе ніхто не вывучаў, не след паўтараць памылкі мінулага, а лепш, кіруючыся армейскім загадам, павярнуцца тварам да праблем «ваенкі» і правесці канструктыўную гутарку з удзелам прадстаўнікоў рэктарата, грамадскіх арганізацый, ваеннай кафедры і кафедры грамадзянскай абароны, студэнцтва. Мы «за». А вам прапануем выказваць свае меркаванні па тэлефоне: 20-68-27.

НАТАТКІ З ПРЫХІЛЬНАСЦЮ

ВАЕННАЯ СПРАВА

ЛІСТ РОСПАЧЫ

Філа-меды-лолагі?

Адно пытанне мучыць нас з пачатку навучальнага года: навошта філолагам пасведчанне аб атрыманні спецыяльнасці медыцынскай сястры грамадзянскай абароны? За ўсю гісторыю факультэта ніхто з нашых студэнтак не стаў медработнікам, хоць на вывучэнне медыцынскай падрыхтоўкі адведзена 350 гадзін, у той час, калі на рускую мову і літаратуру толькі 450. Гаворыць, усе так вучыліся, і мы павінны уціхамірыцца.

Нас цікавіць сістэма «падбору» факультэтаў для праходжання курса па «ваенцы». Чаму не займаюцца ёй студэнткі біялагічнага і хімічнага, калі авалодваюць блізкай спецыяльнасцю?

Магчыма, патрабаваць адказу смешна і наіўна. Але нам зусім не да ўсмешак.

У нашай краіне жанчыны становяцца ваеннаабавязанымі толькі па ўласнаму жаданню, а мы чамусьці пад прымусам вучэбнай нагрузкі.

Зразумела, пачатковыя веды па медыцыне неабходны кожнаму. Але навошта нас вучыць выпісваць рэцэпты на лацінскай мове? Каму патрэбны нашы паходы на аперацыі, пры адным напаміне аб якіх некаторыя дзяўчаты страчваюць прытомнасць? Ці так ужо ахвотна займаюцца з практыкантамі «дзеля інтарэсу» урачы ў бальніцах? Мы ж не студэнты медыцынскага інстытута, а фі-ло-ла-гі!

Тым больш, што намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па народнай адукацыі СССР Г. Ф. Куцаў на пытанне карэспандэнта «Комсомольской правды» аб мэтазгоднасці ваеннай падрыхтоўкі дзяўчат-студэнтак адказаў: «Яна застаецца толькі ў медыцынскіх інстытутах».

І дзе-нідзе прыслухоўваюцца да гэтых слоў. Літаральна на днях у інстытуце культуры ўжо адменена медыцынская падрыхтоўка. Чаму? Ходзяць чуткі, што знайшлі нейкі дакумент, дзе гаворыцца аб тым, што тэатралам, культработнікам не трэба вывучаць медыцыну. А чым адрозніваюцца нашы гуманітарныя факультэты ад інстытута культуры?

Чаму б не запрасіць на пасяджэнне рэктарата студэнтаў філфака, журфака і юрфака і не выслухаць іх меркаванні?

Хіба прымаць валявыя рашэнні лягчэй, чым знаходзіць узаемаразуменне?

СТУДЭНТКІ 2-ГА КУРСА
ФІЛАЛАГІЧНАГА
ФАКУЛЬТЭТА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
20 красавіка
Зак. 1620.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.